*4.* DJ // The new Grove dictionary of music and musicians : in 29 vol. / ed. : S. Sadie ; executive ed. : J. Tyrrell. – 2nd ed. – New York ; London, 2001. – Vol. 7. – P. 406–407.

*5.* DJing // Bynoe, Y. Encyclopedia of rap and hip-hop culture / Y. Bynoe. – Westport, 2006. – P. 89.

*6.* In the studio with Vitalic // Future music : making music with technlogy. – 2013. – Iss. 268 (+DVD). – P. 40–46.

*7.* Mix // The new Grove dictionary of music and musicians : in 29 vol. / ed. S. Sadie ; executive ed. J. Tyrrell. – 2nd ed. – New York ; London, 2001. – Vol. 16. – P. 766.

# СТУПЕНЬ ВЫВУЧАНАСЦІ МУЗЫЧНАЙ КУЛЬТУРЫ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ 20–30-х гг. XX ст.

***В. В. Сідаркевіч,***
*студэнтка аддзялення музыказнаўства*
*Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Першая палова XX ст. у жыцці нашай краіны характарызуецца складанай напружанай палітычнай сітуацыяй: Першая сусветная вайна, рэвалюцыйнае паўстанне ў Расійскай імперыі, яе распад і як вынік – падпісанне Рыжскага мірнага дагавору 18 сакавіка 1921 г. паміж ужо Савецкай Расіяй і новымі дзяржавамі – Украінай, II Рэччу Паспалітай (Польшчай). Галоўнай умовай пагаднення з’явіўся адыход часткі беларускіх зямель да Польшчы. Гэта былі Гродзенская губерня, Навагрудскі, Пінскі, часткі Слуцкага, Мазырскага і Мінскага паветаў Мінскай губерні, а таксама Ашмянскі, Лідскі, Вілейскі, Дзісненскі паветы Віленскай губерні [3, с. 109]. Дадзеныя тэрыторыі пачалі называцца ў савецкай літаратуры Заходняя Беларусь, а ў польскай – «усходнія крэсы». Такім чынам, на былых землях Рэчы Паспалітай сфарміраваліся некалькі дзяржаў: Савецкая Беларусь, II Рэч Паспалітая, Савецкая Украіна.

Да разгляду пытанняў, якія тычыліся лёсу Заходняй Беларусі ў акрэслены перыяд, даследчыкі звярталіся даўно, аднак у большай частцы навуковай літаратуры дастаткова падрабязна разглядаюцца гісторыка-палітычных падзей. У музычна-культурнай сферы такіх прац значна менш. Варта адзначыць малую

цікавасць да разгляду гэтай праблематыкі ў супастаўленні з культурай БССР 20–30-х гг. XX ст.

Чаму мы так мала ведаем аб мастацве Заходняй Беларусі гэтых часоў? Як вядома, на гэтых землях панавала польская культура, да якой у Савецкай дзяржаве былі рэзка адмоўныя адносіны. У асноўным ва ўсіх даследаваннях акрэсліваюцца толькі негатыўныя моманты гэтага перыяду, напрыклад: «У польскай дзяржаве праводзілася паслядоўная, наступальная і бескампрамісная асімілятарская палітыка, якая ажыццяўлялася метадамі эканамічнай, палітычнай, ідэалагічнай і культурна-асветніцкай дыскрымінацыі нацыянальных меншасцей, а таксама з дапамогай рэпрэсій і пераследаванняў»; «Беларусы ўспрымаліся органамі польскай дзяржавы як нелаяльныя грамадзяне»; «Польскія ўлады ўспрымалі беларусаў як людзей, пазбаўленых нацыянальнай культуры» [3, с. 109–110]. Такія выказванні яшчэ раз пацвярджаюць негатыўную ацэнку палітыкі Польшчы да беларусаў.

Аднак у апошні час адбываецца пераацэнка тых падзей і некаторыя навукоўцы пачынаюць адкрываць і пазітыўныя моманты. Напрыклад, А. Вашкевіч і А. Чарнякевіч у артыкуле «Польскі Гродна: эвалюцыя горада ў міжваенны час (1919–1939 гг.)» так ацэньваюць стаўленне заходніх беларусаў да «заснавальніка» II Рэчы Паспалітай Ю. Пілсудскага. «Беларускае насельніцтва абсалютна не рэагіруе на лозунгі, – прамаўляў ад імя Ю. Пілсудскага А. Аршун, – у ягонай свядомасці адбыўся гістарычны пералом у адносінах да Польшчы. Прычына гэтага ў перакананні, што Ю. Пілсудскі дасць беларусам сам усё патрэбнае, бо ён сам родам з гэтых краёў» [9, с. 347]. Далей яны пішуць: «Палякі прадставілі магчымасць узаемнай камунікацыі і свабоду слова і друку. У 1920–1930-я гады ў Гародні выходзіла каля дзесятка газет, сярод якіх, адзначым, польскамоўныя: “Nowy Dzennik Kresowy”, “Nadniemeński Kurjer Polski”, выдаваліся яўрэйскія газеты “Grodner Radjo” і інш. Першыя беларускія газеты бяруць пачатак з 1919 года: “Беларускі народ”, “Бацькаўшчына”, “Зоркі”, “Беларускае слова”, “Беларуская думка”» [9, с. 349].

У музыказнаўстве на жаль, аб’ектыўная ацэнка культурных дасягненняў Заходняй Беларусі пакуль адсутнічае. На сённяшні дзень музыказнаўцамі ўведзена ў навуковы абіход некалькі



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

персаналій беларускіх кампазітараў, цесна звязаных з ІІ Рэччу Паспалітай, – пераважна тых, якія ў сваёй творчасці развівалі менавіта беларускую лінію. Задача нашай работы – паказаць ступень вывучанасці музычнай культуры Заходняй Беларусі 20–30-х гг. ХХ ст.

Напэўна, найбольш вядомым музыкантам Заходняй Беларусі на сённяшні дзень з'яўляецца Р. Шырма. Манаграфія па яго творчасці, дзе вельмі падрабязна вывучаны творчы і жыццёвы шлях кампазітара, яго ўклад у развіццё народнай музычнай творчасці належыць С. Нісневіч [15]. Нельга забываць і пра дзейнасць Р. Шырмы ў Таварыстве беларускай школы (ТБШ), дзе ён уваходзіў у склад галоўнай управы і займаў актыўную пазіцыю ў барацьбе за прызнанне беларускай нацыянальнай культуры. У сваіх успамінах музыкант прыгадвае цікавы момант, калі яму пагражаў арышт. Р. Шырма піша: «Аднойчы прыходзіць да мяне ад КПЗБ[18] хлопец са Стаўпеччыны (Стаўбцоўшчыны, – *А. В.*) Мікалай… і прапануе, каб я напісаў, што выходжу з Галоўнай управы ТБШ, тады, маўляў, мне на судзе лягчэй будзе (ім, як і панам, трэба было ліквідаваць ТБШ). А я кажу: "Я не хачу, каб мне было лягчэй на судзе, я хачу, каб так, як другім, было. Я не хачу, каб пасля мяне ўсе ганьбілі ў гісторыі, плявалі, што я памагаў пілсудчыкам ліквідаваць ТБШ"» [2, с. 89–90].

Вывучэннем музыкі Заходняй Беларусі займаецца В. Скарабагатаў, якім быў выдадзены зборнік «Зайгралі спадчынныя куранты» [6] і манаграфія, прысвечаная творчасці і жыццёваму шляху Я. Тарасевіча [7].

Да разгляду творчага шляху аднаго з выбітных кампазітараў і паэтаў Заходняй Беларусі К. Галкоўскага (1875–1963) звяртаюцца Л. Луцкевіч [4], І. М. Шумская [10], І. Арэф'ева [11].

К. Галкоўскі нарадзіўся і атрымаў сярэднюю адукацыю ў Вільні. Пасля музыкант паступіў у Пецярбургскую кансерваторыю. Яго настаўнікамі былі М. Рымскі-Корсакаў, А. Лядаў. Скончыўшы кансерваторыю, К. Галкоўскі вяртаецца ў Вільню і заступае на пасаду дырыжора першага сімфанічнага аркестра. Можа, таму творчасць гэтага кампазітара заўсёды ў большай

[18] Камуністычная партыя Заходняй Беларусі.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ступені звязвалі з Вільняй, яго лічылі «рускім кампазітарам, які жыў у Літве» [10, с. 115]. Аднак прафесар П. Буткус адзначыў, што К. Галкоўскі «ўвайшоў у гісторыю мастацтва і культуры краіны як інтэрнацыяліст і вялікі патрыёт Нёманскага краю» [10, с. 115]. Трэба дадаць, што ў 20–30-я гг. К. Галкоўскі вельмі плённа працаваў над развіццём беларускай лініі ў музыцы.

Актыўную грамадскую і творчую пазіцыю займаў кампазітар, музыказнаўца, дырыжор, фалькларыст П. Каруза (1906–1988). На жаль, постаць П. Карузы не моцна зацікавіла ўвагу даследчыкаў. Звернем увагу на артыкул І. М. Шумскай «Роля музычных дзеячаў Віленшчыны ў развіцці міжнацыянальных культурных стасункаў» [10] і на працу У. Скрабатуна [8].

П. Каруза нарадзіўся ў Дзісненскім раёне ў в. Ваўкалатка. Хлопцам ён скончыў Браслаўскую гімназію, пасля вывучаў сацыялогію і эканоміку, з’яўляючыся адначасова вольным слухачом Віленскага ўніверсітэта і студэнтам Віленскай кансерваторыі па класе тэорыі і кампазіцыі.

Выхадцамі з ІІ Рэчы Паспалітай былі важнейшыя дзеячы беларускай музычнай культуры пасляваеннага перыяду, класікі беларускай музыкі Л. Абеліёвіч, Э. Тырманд, Г. Вагнер, вывучэннем творчасці якіх актыўна займаецца І. Двужыльная [12–14].

Такім чынам, нам прадстаўлена вельмі малая колькасць музычных персаналій. На першы погляд, гэта можа сведчыць аб беднай панараме музычнага жыцця на тэрыторыі Заходняй Беларусі. Але, нам здаецца, гэта не адпавядае рэчаіснасці. Перад сучаснымі музыказнаўцамі паўстае задача паказу існавання актыўных музычна-культурных працэсаў на гэтай тэрыторыі, якія не абмяжоўваліся выключна беларускай нацыянальнай лініяй, і такая работа яшчэ наперадзе.


1. *Вабішчэвіч, А. М.* Культурна-асветніцкае жыццё нацыянальных меншасцей у Заходняй Беларусі (1921–1939) / А. М. Вабішчэвіч // Берасцейскі хранограф. – 2004. – С. 212–218.

2. *Вабішчэвіч, А. М.* Таварыства беларускай школы / А. М. Вабішчэвіч // Беларускі гістарычны часопіс. – 1997. – № 1. – С. 86–92.

3. *Даніловіч, В. В.* Беларуская культурная прастора ў Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) / В. В. Даніловіч // Вес. Беларус. дзярж. акад. музыкі. – 2012. – № 21. – С. 108–116.




РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

4. *Луцкевіч, Л.* Канстанцін Галкоўскі (1875–1963). З серыі «Партрэты віленчукоў» / Л. Луцкевіч, Г. Войцік. – Вільня, 2001. – 17 с.

5. *Макарская, Д. А.* Беларускія матывы ў творчасці Яна Тарасевіча / Д. А. Макарская // Пытанні музычнай культуры Беларусі і свету ў сучасных даследаваннях : навук працы БДАМ / склад. Т. Л. Бяркові. – Мінск : БДАМ, 2007. – Вып. 15. Сер. 1, Беларуская музычная культура. – С. 55–61.

6. *Скарабагатаў, В. І.* Зайгралі спадчынныя куранты : Цыкл нарысаў з гісторыі праф. муз. культуры Беларусі / В. І. Скарабагатаў. – Мінск : Тэхналогія, 1998. – 154 с.

7. *Скарабагатаў, В. І.* Абыйшоўся без славы..: кампазітар Ян Тарасевіч / В. І. Скарабагатаў. – Мінск : Тэхналогія, 2001. – 139 с.

8. *Скрабатун, У.* Павел Іосіфавіч Каруза / У. Скрабатун // Вольнае Глыбокае. – 2004. – 19–25 лютага. – С. 6.

9. *Чарнякевіч, А.* Польскі Гродна: эвалюцыя горада ў міжваенны час (1919–1939) / А. Чарнякевіч, А. Вашкевіч // Arche-Пачатак. – 2010. – № 1–2. – С. 306–384.

10. *Шумская, І. М.* Роля музычных дзеячаў Віленшчыны ў развіцці міжнацыянальных музычных стасункаў / І. М. Шумская // Вес. Беларус. дзярж. акад. музыкі. – 2013. – № 22. – С. 114–117.

11. *Арефьева, И.* Композитор Константин Галковский – последний из могикан вильнюсского романтизма [Электронный ресурс] / И. Арефьева // Живой колос. – Режим доступа : http://www.kolos.lt/content/ view/238. – Дата доступа : 23.10.2011.

12. *Двужильная, И.* «Элегическая импровизация» Эди Тырманд: к вопросу содержательного аспекта / И. Двужильная // Актуальные проблемы мировой художественной культуры : материалы Междунар. науч. конф., посвящ. памяти профессора У. Д. Розенфельда, Гродно, 5–6 апр. 2012 г. : в 2 ч. – Гродно : ГрГУ, 2012. – Ч. 1.

13. *Двужильная, И. Ф.* Генрих Вагнер и канторское искусство / И. Ф. Двужильная // Вес. Беларус. дзярж. акад. музыкі. – Мінск, 2009. – № 14. – С. 55–59.

14. *Двужильная, И. Ф.* Лев Моисеевич Абелиович в воспоминаниях современников (в преддверии 100-летия со дня рождения) / И. Ф. Двужильная // Музычная культура на скрыжаванні эпох : навук. працы Беларус. дзярж. акад. музыкі. – Мінск, 2011. – Вып. 26, Сер. 1, Беларуская музычная культура. – С. 239–250.

15. *Нисневич, И.* Григорий Романович Ширма. Очерк жизни и творчества / И. Нисневич. – Изд. 2-е. – Л. : Музыка, 1971. – 80 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ